ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.28 (3292) ● ЧАЦВЕР, 2 ЖНІЎНЯ, 2012

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Іх парадніла мора
Пад Мінскам адкрыўся мемарыял-помнік “Маракам зямлі беларускай — ад удзячнай Расіі” Стар. 2

Танец пад назваю “Бульба”
Гэты танец лічыцца на Беларусі народным, але ж некалі яго паставіў знакаміты харэограф Ігар Майсееў Стар. 3

Там, дзе рэчка недалёка...
Сто гадоў таму жнівеньскім вечарам на хутары Смольня ўпершыню сустрэліся Якуб Колас і Янка Купала Стар. 4

ДАЛЯГЛЯДЫ СЯБРОЎСТВА

“Нёман” імкнецца да вытокаў

На святкаванні Дня горада ў Ваўкавыску гасцявала дэлегацыя тальяцінскі беларусаў

Іна Ганчаровіч

Праект “Адміністрацыйны рэгіён Беларусі — арганізацыя суайчыннікаў за мяжой” доўжыцца не адзін год. Ён дапамагае развіццю кантактаў розных рэгіёнаў краіны з беларускімі суполкамі замежжа. Праект ініцыяваў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, яго падтрымлівае Міністэрства замежных спраў. І кантакты Ваўкавыскага райвыканкама з Нацыянальна-культурнай аўтаноміяй “Нёман” горада Тальяці — добры прыклад дзелавога партнёрства.

Яшчэ на пачатку 2006-га ў офісе таварыства па сувязях з суайчыннікамі “Радзіма” ў Мінску кіраўнік ансамбля народнай музыкі і песні “Уладары” з Ваўкавыска Вадзім Бычак знаёміўся з Людмілай Дзёмінай. Яна ў чарговы раз тады завітала на Бацькаўшчыну і, як чалавек энергічны і кантактны, прапанавала землякам “руку на дружбу”. Спачатку былі сяброўскія стасункі паміж творчымі калектывамі, пазней з’явілася і пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, спорту і турызму, гандлю — паміж Ваўкавыскім раёнам і суполкай “Нёман”. Па запрашэнні Ваўкавыскага райвыканкама беларусы-тальяцінцы і сёлета наведалі сяброў. Уражаннямі пра паездку дзеліцца старшыня праўлення суполкі Людміла Дзёміна.

Суайчыннікі прывезлі ў Ваўкавыск знакавы падарунак з Тальяці

— Людміла Іванаўна, рады вітаць вас на Бацькаўшчыне! Як сустрэла землякоў Беларусь?

— Мы амаль штогод прыязджаем у Беларусь, і нас заўсёды цудоўна сустракаюць. Сёлета мы ў гасцях па запрашэнні мэра Ваўкавыска Міхаіла Сіцько, гэта для нас падзея. Прыемна бачыць Беларусь прыгожай: дагледжаную зямлю, палеткі з ураджаем. І тут такія добрыя, спагадлівыя людзі. Усё гэта радуе і... трохі засмучае: мы ж так далёка жывём ад Радзімы.

— Чым поўніліся дні вашага гасцявання ў Ваўкавыску?

— Паездка вельмі насычаная, з нечаканымі прыемнымі сюрпрызамі для нас. Мы прыехалі вялікай дэлегацыяй: з вакальнымі ансамблямі “Купалінка” (дарослыя) і “Зорачкі” (дзеці), а таксама харэаграфічным ансамблем “Серпантын”. Мэрыя горада сустрэла нас караваем, мы абмяняліся сувенірамі, падарункамі, у тым ліку і ад мэрыі Тальяці, прафкама таварыства “АўтаВАЗ”, дзіцячай школы музыкі імя М. Балакірава. Падарылі мы беларускаму гораду і работу заслужанага мастака Расіі скульптара Аляксея Кузняцова: у прыгожай рамцы вялізная ладдзя-барэльеф, на ветразі яе намаляваны ўсе машыны АўтаВАЗа. Падарунак цяжкі, мы асцярожна везлі яго на машыне і радаваліся, што ў Беларусі выдатныя дарогі: даехалі “як па масле”. У Ваўкавыску калектывы далі некалькі канцэртаў, якія вельмі спадабаліся жыхарам. Пазней у Мінску мы сустрэліся з намеснікам Міністра культуры Тадэвушам Стружэцкім, намеснікам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Уладзімірам Ламекам і дырэктарам Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міхаілам Рыбаковым. Абмяркоўвалі нашы справы, планы, праблемы. Нам прыемна, што па выніках работы за мінулы год наша, беларуская суполка прызнана адной з наймацнейшых у Самарскай вобласці, нас адзначылі Дыпломам дружбы народаў. Я ж атрымала і Ганаровую грамату ад Міністра культуры Беларусі — для мяне гэта вялікая ўзнагарода. ➔ Стар. 2

СУПОЛЬНАСЦЬ

З Ерэвана — з любоўю

Медалём Францыска Скарыны ўшанаваны старшыня грамадскага Армянскага таварыства “Айастан” у Мінску Георгій Егіазаран

Кацярына Мядзведская

Ён больш за дваццаць гадоў узначальвае армянскую супольнасць у Мінску. А з 2006-га — і Кансультатыўны міжэтнічны савет пры апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Высокую ўзнагароду Георгій Егіазаран успрымае як агульную заслугу. “Гэтым медалём Прэзідэнт Беларусі адзначыў шматгадовую работу ўсіх нацыянальных суполак, што існуюць у краіне”, — лічыць Георгій Анушаванавіч.

З 1979 года былы ерэванец жыве ў Беларусі. І за гэты час нікольні не расчараваўся ў тым, што другой радзімай для яго стала зямля сінявокіх азёр і бяскрайніх лясоў. Аднак і любоў да Арменіі грэе сэрца. Георгій расказвае, як пасля заканчэння школы і Кіеўскага інстытута інжынераў грамадзянскай авіяцыі пайшоў на курсы экскурсаводаў: вельмі яму падабаўся родны Ерэван, і хацелася ўсяму свету расказваць пра яго самабытную гісторыю і прыгажосць. Пад час адной з экскурсій і пазнаёміўся з будучай жонкай. Жыць маладыя вырашылі ў Мінску, і не шкадуюць. “Часта па справах даводзіцца бываць у розных краінах, — гаворыць Георгій Егіазаран. — Аднак такой цеплыні ў стасунках паміж людзьмі няма нідзе. Да чалавека тут заўсёды ставяцца з павагай, і нацыянальнасць не мае значэння, галоўнае — тыя якасці, якімі валодаеш”. Беларусаў Георгій Анушаванавіч называе мяккімі, добрымі, разумеючымі… Армяне, лічыць, такія ж, толькі больш эмацыйныя.

Штогод Георгій бывае ў Арменіі, наведвае родных, сяброў. Удзельнічае ў з’ездах суайчыннікаў свету, дзе прадстаўляе армян Беларусі. А нядаўна, расказвае, здзейсніў даўно задуманае: пазнаёміў нарэшце жонку, дзяцей і ўнукаў са сваёй Радзімай. Прычым такой, якой сам яе ўяўляе. Ён зноў пераўтварыўся ў гіда і некалькі дзён праводзіў для родных экскурсіі па любімых мясцінах Арменіі, незабыўных кутках свайго маленства…

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Георгій Егіазаран

І ў Мінску ёсць месцы, блізкія сэрцам армян. Гэта вуліцы Гая, Алібегава, Авакяна, герояў вайны, што вызвалялі Беларусь ад фашыстаў, знакамітага армянскага мастака Івана Айвазоўскага. ➔ Стар. 2

СЫНЫ АЙЧЫНЫ

Іх параднiла мора

Пад Мінскам адкрыўся мемарыял-помнік “Маракам зямлі беларускай – ад удзячнай Расіі”, створаны сумеснымі намаганнямі ветэранаў флота абедзвюх краін. У праекце ўдзельнічаюць прадстаўнікі розных народаў, якіх параднілі мора і служба марская.

БЕЛТА

Урачыстае адкрыццё мемарыяла-помніка “Маракам зямлі беларускай – ад удзячнай Расіі”

Іван Іванаў

Хоць Арсен Крыцкі і нарадзіўся ў расійскім Геленджыку, ды родавыя карані ў яго беларускія. Ён, каардынатар і аўтар міжнароднага праекта “Марское братэрства – непарушнае!”, актыўна ўдзельнічае ў рабоце ўсерасійскай грамадскай арганізацыі марскіх пехацінцаў “Тайфун”. Напярэдадні адкрыцця мемарыялу марпех Крыцкі расказваў журналістам, што пад час службы на Ціхаакіянскім флоце меў шмат сяброў-беларусаў, захацелася і далей падтрымліваць з імі сувязі. Так пачыналася сумесная расійска-беларуская дзейнасць энтузіястаў па ўшанаванні памяці маракоў-герояў, а ў хуткім часе ўзнікла і задума мемарыяла. Арсеній Крыцкі нагадаў, што кантынентальная Беларусь 300 гадоў разам з Расіяй стварала флот і запэўніў, што “беларусы – самыя вялікія маракі”. Ды і на многіх гербах беларускіх гарадоў ёсць сімвалы карабля.

Па Дзвіне, Нёмане, Дняпры спрадвеку нашы супляменнікі маглі дайсці на ладдзях да халодных і цёплых мораў. Кажуць, у даўнія часы цэлыя экіпажы на суднах вікінгаў былі з Падзвіння. Калі 300 гадоў таму Пётр I ствараў расійскі флот, спатрэбіліся людзі з адпаведнымі навыкамі. У адным з нумароў расійскага часопіса “Морская пехота” чытаем: “16 (27) лістапада 1705 года у горадзе Гродна быў сфарміраваны першы марскі полк графа Фёдара Галавіна, які меў у сваім складзе 1200 чалавек і які стаў родапачынальнікам марской пяхоты ў Расіі. Гэтую дату і прынята лічыць за кропку адліку ў гісторыі расійскай марской пяхоты. Полк графа Галавіна прызначаўся для службы ў абардажна-дэсантных камандах на баявых караблях паруснага флота”.

На прэс-канферэнцыі згадваліся слаўныя старонкі марской гісторыі Беларусі, імёны герояў з беларускімі родавымі каранямі, найперш камандзіра брыга “Меркурый”, ураджэнца Дуброўна Аляксандра Казарскага. Напярэдадні дня ВМФ, які ў Беларусі і Расіі адзначаецца ў апошнюю нядзелю ліпеня, згадалі: 2 жніўня 1902 года ў Баранавічах нарадзіўся Георгій Халасцякоў — вядомы савецкі ваеначальнік, віцэ-адмірал і Герой Савецкага Саюза. Увогуле ж больш за 70 адміралаў расійскага, савецкага Ваенна-Марскога флота былі родам з Беларусі.

Адзін са знакавых сімвалаў мемарыяла, які адкрыўся 27 ліпеня пад Мінскам, – якар ад карабля-парусніка, які называлі адміралцейскім. Ён затануў у пятроўскія часы, падняты з дна Балтыкі, з Фінскага заліва ў наш час. Летась гэты дар Беларусі ад маракоў Расіі ўрачыста даставілі ў Мінск, у ганаровым эскорце былі дэлегаты з многіх гарадоў ваенна-марской славы, ветэраны флота.

На адкрыццё мемарыяла, які называлі “помнікам усім, хто загінуў на моры і аддаў яму частку жыцця і душы”, прыехала шмат былых маракоў з рэгіёнаў краіны. З часам ля “марскога мемарыяла” адкрыецца экспазіцыя “Марская слава Беларусі”. А плаваючы танк, падарунак маракам ад фонда “Памяць Афгана”, ужо стаіць побач з якарам.

Даведка “ГР”. У Беларусі жывуць каля 200 тысяч чалавек, якія служылі ў розныя гады ў часцях ВМФ СССР. З 1945 па 1992 год ваенную службу на флоце прайшлі каля мільёна беларусаў.

СУПОЛЬНАСЦЬ

З Ерэвана — з любоўю

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Імем вядомага дзеяча савецкага перыяду Аляксандра Мяснікова (Мяснікяна) названа адна са сталічных плошчаў. А ў мінскай сярэдняй школе № 4 больш за 20 год па нядзелях праходзяць заняткі па армянскай мове, літаратуры, культуры, гісторыі. У 1992-93 гадах іх вёў і Георгій. Узгадвае: на заняткі прыходзіла да 40 вучняў, узрост якіх — ад ад шасці да... сямідзесяці гадоў. Сёння цікавасць да нацыянальнай адукацыі ўзрасла, і ў школе працуюць ужо сем класаў. Ёсць у беларускіх армян і свой гістарычны крыж-помнік хачкара, усталяваны на Вайсковых могілках у Мінску. Каля яго суайчыннікі ўшаноўваюць памяць землякоў, загінулых пад час землятрусу ў 1988 годзе.

Армянскія традыцыі, прызнаецца Георгій Анушаванавіч, такія ж, як у беларусаў: з пашанай ставіцца да старэйшых, у сям’і галоўным лічыцца мужчына. І святы ў армян і беларусаў аднолькавыя: Новы год, Каляды, 8 Сакавіка, Дзень Перамогі… Аднак ёсць і адметнасці. Напрыклад, армянскі Новы год — Навасар — святкуецца не зімой, а 11 жніўня. Лічыцца, што менавіта ў гэты дзень Ноеў каўчэг прыстаў да гары Арарат. Да традыцый беларускіх армян дадаўся і абрад Хрышчэння. Армянскай царквы ў краіне няма, але ахрысціцца па пэўных праваслаўных канонах можна цяпер у храме пры мінскім Доме міласэрнасці.

“Мы не адчуваем сябе ў Беларусі чужымі, — гаворыць Георгій Егіазаран. — Наадварот, удзячны за тое, што тут можна захоўваць і мову, і традыцыі, прадстаўляць сваю культуру”. Ансамбль народнай песні і танца “Эрэбуні”, створаны пры таварыстве “Айастан”, з 1998 года ўдзельнічае ў Фестывалі нацыянальных культур, неаднойчы станавіўся яго лаўрэатам. Без самабытнага калектыву не абыходзяцца фестывалі “Сузор’е”, “Вянок дружбы”, “Сонечны птах” і іншыя. Цяпер ансамбль гастралюе па Арменіі.

Яшчэ адзін клопат Георгія Егіазарана — работа Кансультатыўнага міжэтнічнага савета, у які ўваходзяць кіраўнікі 25 нацыянальных аб’яднанняў. “Сяброўскія, па-сямейнаму цёплыя склаліся стасункі паміж намі, — прызнаецца Георгій. — Разам размяркоўваем сродкі, якія паступаюць ад дзяржавы: каму на касцюмы, каму на аргтэхніку ці музінструменты... Разам планы будуем”.

Дарэчы, у апошні час такіх сумесных праектаў стала больш. Прадстаўнікі розных этнасуполак гэтай вясной саджалі дрэвы каля вёскі Каралеўшчына пад Івянцом, а раней алею дружбы стварылі ў Азярцы пад Мінскам. Нядаўна прайшла сумесная кніжная выстава, а на Фестывалі нацыянальных культур у Гродне працавалі фотавыставы “Беларусь — шматнацыянальная” і “У аб’ектыве — старонкі гісторыі фестывалю”.

ДАЛЯГЛЯДЫ СЯБРОЎСТВА

“Нёман” імкнецца да вытокаў

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

— Чым жывуць цяпер беларусы Тальяці?

— Мэрыя наша, як вядома, вылучыла моцным нацыянальным арганізацыям, накшталт нашай, па 10 сотак зямлі для арганізацыі этнавёсак. На жаль, фінансава нам не пад сілу нешта збудаваць. Спадзяемся на спонсараў. Яшчэ задума: пры падтрымцы новага мэра Сяргея Андрэева адкрыць Дом дружбы народаў. Цяпер пры Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Нёман” у Тальяці працуюць гурт “Купалінка”, якому 7 гадоў, і дзіцячы ансамбль “Зорачкі” — яму толькі 2. Дзеці ідуць да нас ахвотна, вывучаюць мову, спяваюць песні, чытаюць вершы па-беларуску.

Дзіцячы ансамбль “Зорачкі” з Тальяці выступае ў Ваўкавыску

На базе 46-й школы працуе беларускі клас, у планах адкрыццё беларускай школы. Многія беларусы Тальяці далучаюць да культуры дзядоў і прадзедаў дзяцей і ўнукаў. Нашы гурты ўдзельнічаюць у гарадскіх культурных мерапрыемствах, у нас шмат паклоннікаў.

— Вы расказваеце пра нашу гісторыю і культуру на Волзе. Адкуль чэрпаеце інфармацыю?

— Мы ўдзячныя Міністэрству культуры і рэдакцыі газеты “Советская Белоруссия” за выданні “Союзное вече” і “Голас Радзімы”, якія атрымліваем па пошце. У газетах шмат цікавай інфармацыі пра Беларусь, мы расказваем жыхарам Тальяці аб дасягненнях Радзімы ў розных галінах навукі, тэхнікі, медыцыны, адукацыі, пра супрацоўніцтва з іншымі краінамі. І прыём Беларускага тэлебачання ёсць, канал глядзяць не толькі беларусы. У Тальяці жывуць прадстаўнікі больш чым 100 нацыянальнасцяў. Мы сябруем, ходзім адзін да аднаго на мерапрыемствы. А беларусаў любяць усе, у тым ліку і за якасныя тавары: прадукты, адзенне, трыкатаж, касметыку, мэблю... Пакуль у Тальяці няма Беларускага гандлёвага дома, а ён патрэбен. Я ўпэўнена: беларускі тавар пайшоў бы там “на ўра”. А калі мы гаворым пра Беларусь, усё захапляюцца — якія тут чысціня і парадак.

У заключэнне хачу сказаць, што мы любім газету “Голас Радзімы” і вельмі рады, што ўжо год рэгулярна атрымліваем яе па пошце. Выданне вельмі цікавае і патрэбнае! Мы шмат даведваемся пра суайчыннікаў у іншых рэгіёнах свету: чым жывуць, што ў іх новага. Бачылі б вы, якія эмоцыі ахопліваюць пажылых людзей, калі яны бачаць беларускія літары, родныя краявіды на здымках! Гэта да слёз кранальна. Таму калі магчыма — дасылайце больш экземпляраў. А калі змогуць выдаўцы павялічыць колькасць старонак у выданні, то, думаю, усе беларусы замежжа такое рашэнне падтрымаюць.

КУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА

Танец пад назваю “Бульба”

Гэты танец лічыцца на Беларусі народным, але ж некалі яго паставіў знакаміты харэограф Ігар Майсееў

Іна Ганчаровіч

“Біс! Брава! Малайцы!” Бурнае захапленне выклікаў літаральна кожны нумар, які прадстаўляў нядаўна Дзяржаўны акадэмічны ансамбль народнага танца імя Ігара Майсеева на “Славянскім базары ў Віцебску”, на сцэне Летняга амфітэатра. Шэсць тысяч месцаў – і поўны аншлаг! Апісваць словамі, што адбываецца на сцэне, не мае сэнсу: гэта трэба бачыць. Прычым глядзець на расійскіх віртуозаў танца, мастацтва якіх здзіўляе і захапляе, можна бясконца. Высокая тэхніка, а яшчэ і разумная рызыка, бліскучая акцёрская ігра – усё даведзена да дасканаласці.

Ігара Майсеева па праву называюць найвялікшым харэографам XX стагоддзя. Мэтр ушанаваны мноствам узнагарод, ганаровых званняў і тытулаў. Ён першы ў свеце прыдумаў і стварыў прафесійны харэаграфічны ансамбль. Гэта да таго ж першы і адзіны прафесійны калектыў, які займаецца мастацкай інтэрпрэтацыяй танцавальнага фальклору народаў свету. І першы ансамбль народнага танца, які атрымаў званне “акадэмічны”. Яму апладзіравалі ў розных кутках планеты, і за рэкордную колькасць гастроляў калектыў занесены ў расійскую Кнігу рэкордаў Гінеса. Па сутнасці, ансамбль Майсеева адлюстроўвае культуру цэлага стагоддзя, не здарма ж ён доўгі час быў прыгожай візітнай карткай СССР. Кажуць, неаднаразова пасля канцэртаў ансамбля наладжваліся дыпламатычныя адносіны, змянялася стаўленне кіраўніцтва шэрагу заходніх краін да Савецкага Саюза.

АЛЯКСАНДР СТАДУБ

Высокае майстэрства дэманстравалі артысты Ансамбля танца імя Ігара Майсеева на віцебскай сцэне

У далёкія 30-я гады Ігар Майсееў пачаў збіраць фальклор. Аб’ездзіў усе рэспублікі былога Саюза. У рэпертуары ансамбля каля трохсот твораў, сярод якіх і беларускія танцы: “Лявоніха”, “Крыжачок”, полька “Янка”, “Бульба”, полька “Мама”, “Юрачка”. Дарэчы, а як нарадзілася “Бульба”, ведаеце? У некаторых рэгіёнах Беларусі сцвярджаюць, што “Бульба” – наш народны танец. На самай справе Ігар Аляксандравіч паставіў яго на матыў народнай беларускай песні, раней такога танца не было. У аўтабіяграфіі І. Майсеева чытаем: “Я цікавіўся фальклорам, ездзіў па беларускіх вёсках. Справа была ўвосень, паспяваў ураджай бульбы. Насустрач нам ішла група дзяўчат, якія неслі на плячах вілы і весела спявалі па-беларуску. Я спытаў майго спадарожніка, пра што яны спяваюць. Аказалася, пра бульбу: прасілі, каб надвор’е дапамагло ёй нарадзіцца, тады год будзе сыты, шчаслівы, а значыць, будуць і песні, будуць і танцы. Вярнуўшыся ў Маскву, я зрабіў танец пад назвай “Бульба”. Калі гадоў праз 15 я зноў пабываў у Беларусі, то даведаўся, што ўсюды танцуюць маю “Бульбу”! Пытаюся: адкуль у вас гэты танец? Мне адказваюць: “А ён у нас заўсёды быў”. Хоць усе фалькларысты пацвярджалі, што гэты танец з’явіўся ў Беларусі пасля маёй пастаноўкі”.

І яшчэ адзін цікавы факт з творчага жыцця Ігара Майсеева, звязаны з Беларуссю. У 1936-м ён упершыню стаў рэжысёрам фізкультурных святаў, якія вельмі любіў Сталін. Атрымалася так паспяхова, што на наступны год было шмат калектываў-прэтэндэнтаў, а Майсееў абраў сярод іх Беларускі дзяржаўны тэхнікум фізічнай культуры. Пазней Ігар Аляксандравіч успамінаў: “Кожны тыдзень я ездзіў у Мінск на два дні для падрыхтоўкі выступлення, якое задумвалася мной у нетрадыцыйнай для парада тэатралізаванай форме. Называлася яно “Граніца на замку”. Красная плошча ператваралася ў бярозавы гай, з яго выходзілі танкі, выбягалі салдаты. Выканаўцы выйшлі на плошчу з маленькімі бярозкамі, загадзя прывезенымі з Падмаскоўя, чым стварылі ілюзію Беларусі. Пасля параду тэхнікум перайменавалі ў інстытут, выканаўцаў узнагародзілі ордэнамі.”

Сёлета знакамітаму калектыву — 75 гадоў. Ён даўно перажыў краіну, у якой нарадзіўся, але і цяпер, як гаворыцца, не здае сваіх пазіцый. Канцэрты гурта імя маэстра Майсеева па-ранейшаму выклікаюць буру станоўчых эмоцый.

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Цёплыя камяні памяці

За ваколіцай вёскі Старое Пашкава Магілёўскага раёна ля дарогі ляжыць вялізны жоран, пакінуты за непатрэбнасцю. А вось два іншыя “вартуюць памяць”: мясцовы жыхар Пётр Пятроўскі пабудаваў з іх помнік хутару свайго дзеда, Цімафея Іосіфавіча.

Пятро Лодкін

Да пачатку калектывізацыі многія жыхары вёсак Старое і Новае Пашкава, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, былі хутаранцамі. Пашкаўскія школьнікі, збіраючы звесткі для стварэння летапісу Бацькаўшчыны, запісалі, у прыватнасці, успаміны Надзеі Гайшун. Надзея Гаўрылаўна, якая нарадзілася ў 1906 годзе, распавяла, што ўладальнікам аднаго з першых хутароў быў яе дзядуля Мітрафан Ухналёў, які пераехаў са Шклоўшчыны. Дзед купіў у памешчыка 28 дзесяцін лесу і падзяліў іх на двух сыноў. Аказваецца, могілкі вёскі Пашкава — на паласе зямлі дзеда Мітрафана, бо завяшчаў ён пахаваць яго на ўласным надзеле. Потым там сталі хаваць і іншых.

Тутэйшыя школьнікі, якія пісалі летапіс мясцовага калгаса імя Валадарскага, цікавіліся і ранейшым жыццём продкаў. Яшчэ ў 1964-м запісалі ўспаміны Пятра Язэпавіча Глушакова, які распавёў, што сяляне Старога Пашкава займаліся вырабам пражы з ільну і канапель (пянькі), ткалі палотны. Побач з вёскай — больш за 30 двароў — стаяў маёнтак, дзе ў 1890 годзе заснаваны мукамольны завод. У Старым Пашкаве ля дарогі была Свята-Мікольская царква. А хутары там ўзніклі “пры Сталыпіне”.

Дзед Пятра Пятроўскага, Цімафей Іосіфавіч, быў у Старым Пашкаве паважаным чалавекам. Пры Савецтах з хутара яго прымусілі ссяліцца: калектывізацыя... На тым месцы цяпер расце бяроза. Працаваў дзед у калгасе конюхам, а яшчэ быў старастам царквы. Яго драўляны дом згарэў у вайну: немцы ноччу па чарзе падпальвалі вясковыя хаты для “асвятлення” акругі.

Пётр Пятроўскі ведае свой радавод

Даўно ўсё было… А ўнуку не давалі спакою аповеды дзеда пра тое, што ў таго на хутары пабываў некалі сам Мікалай II з нейкім генералам. Яны прыязджалі ў гады Першай сусветнай вайны правяраць лінію абароны вакол Магілёва. “Дзед прымаў высокіх гасцей, гаварыў з імі, мёдам частаваў, — ганарыцца мінулым Пётр Герасімавіч. — А яшчэ цар са світай заходзіў у нашу царкву, маліліся ...”

Цікава, што задума стварыць помнік прыйшла яму не сама сабою — было “бачанне”. “Быццам каля бярозы, дзе быў хутар, апускаецца воблака, на якім Бог сядзіць, — распавядае вясковец. — І паказвае на зямлю са словамі: “Гэта святое месца. Схадзі туды, дзе быў млын, прыцягні два жораны, пастаў помнік”. Здарылася тое летам, у непагадь, нацягнуў я боты і адправіўся шукаць жорны. Сапраўды, ляжаць...”

Пётр Герасімавіч дамовіўся з трактарыстам, і той прыцягнуў жорны. Потым кранаўшчык паставіў адзін жоран на другі. Зяць змайстраваў крыж, які ўсталяваны зверху. Побач Пётр Пятроўскі збудаваў лаўкі: каб можна было пасядзець ды падумаць пра жыццё і хуткаплыннасць часу. “У мяне праблемы з сэрцам, — дзеліцца Пётр Герасімавіч. — Доўгія гады вельмі дрэнна сябе адчуваў: часта губляў прытомнасць. Трэба было рабіць аперацыю. Прыйшоў да помніка, давай чытаць малітву. Паклаў рукі на жорны: камяні цёплыя, і мне нібы цяпло сваё перадаюць. Аперацыя прайшла як па масле. Лекар казаў, што выцягнуў мяне з таго свету. Цяпер адчуваю сябе выдатна”.

РОДНЫ БЕРАГ

Там, дзе рэчка недалёка...

Сто гадоў таму жнівеньскім вечарам на хутары Смольня ўпершыню сустрэліся Якуб Колас і Янка Купала

Іван Ждановіч

Хутар Смольня — жывапісная мясціна ў Стаўбцоўскім раёне, непадалёк ад Нёмана і вялікай вёскі Мікалаеўшчына, адкуль вядзецца Коласаў радавод. З 1910 года ў Смольні была сядзіба Міцкевічаў, родных людзей вясковага настаўніка Канстанціна Міцкевіча, які станавіўся на той час вядомым у літаратуры чалавекам: Якубам Коласам.

Цяпер у Смольні створаны літаратурна-мемарыяльны комплекс, за галоўную гаспадыню там Соф'я Пятроўна Міцкевіч. Пад час экскурсій расказвае, што раней тая зямля належала князям Радзівілам, а Коласаў дзядзька Антось сабраў хату, якую "сплавіў па Нёмане з вёскі Яршы". Пэўна, пляменнік, наведаўшы мясцінку ў верасні 1911-га, і прапанаваў дзядзьку ўпрыгожыць яе дрэвамі, прычым і сам спрычыніўся да справы. Ацалелі сем стогадовых ліпаў. Можа, так Колас адзначыў сваё вызваленне з Мінскага астрога, дзе знаходзіўся тры гады?

Дакладна вядома, што пісьменнік вельмі любіў гасцяваць у дзядзькі ў Смольні ў 1911-14 гадах, потым вярнуўся туды толькі ў 1940-м, пасля ўз'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі, наведваўся і ў пасляваенны час. Знакамітая сядзіба найперш тым, што менавіта ў Смольні у жніўні 1912 года ўпершыню сустракаліся Колас з Купалам.

Як тое адбылося? Якуб Колас пасля зняволення быў пад наглядам паліцыі і не мог паехаць да Янкі Купалы, якога ведаў завочна: абодва ж публікаваліся на старонках газеты "Наша ніва". Таму Купала вырашыў наведаць свайго калегу па пяры. Даследчыкі адшукалі ліст ад 26 ліпеня 1912 года, у якім Янка Купала піша: "У суботу еду ў Стоўбцы да Коласа". А Колас так апісваў іх сустрэчу: "…Хтось з дому прыбег у сяло, знайшоў мяне і сказаў мне тры словы: "Прыехаў Янка Купала". Гэтыя словы мяне радасна ўсхвалявалі. Быў ужо даволі позні жнівенскі вечар. Я жыва раздабыў кварту гарэлкі і борздзенька накіраваўся ў Смольню. Так звалася места, дзе была сядзіба маіх родных. У хаце гарэла лямпа. На лаве каля стала сядзеў малады, статны, жыццярадасны хлопец з вясёлымі, крыху насмешлівымі жаўтаватакарычневымі вачамі. Мы павіталіся, зірнулі адзін аднаму ў вочы, пацалаваліся. І ён мне і напэўна я яму паказаліся зусім не такімі, як гэта прадстаўлялі мы сабе ў нашым уяўленні…"

Ліпы ў Смольні. Карціна Уладзіміра Сулкоўскага

Якуб Колас (справа) і Янка Купала

Як вядома, Колас і Купала сябравалі потым усё жыццё, разам працавалі ў Тэрміналагічнай камісіі, Інстытуце Беларускай Культуры, Акадэміі навук БССР. Разам і ў Маскву ездзілі на з'езды Саветаў, сесіі Вярхоўнага савета СССР. У 30-я абодва жылі ў Мінску, хадзілі адзін да другога ў госці, гулялі ў шахматы, дзяліліся планамі. Якуб Колас успамінае: "Купала быў маім частым госцем, таксама як і я быў госцем у Купалы. Мы ішлі рука ў руку дарогамі нашага жыцця."

На жаль, жыццёвая дарога Янкі Купалы трагічна абарвалася ў гасцініцы "Масква" ўночы 28 чэрвеня 1942 года. Якуб Колас востра перажываў трагедыю, прысвяціў памяці сябра верш "Над магілаю друга", дапамагаў выдаць кнігу памяці Янкі Купалы, якая выйшла ў Маскве яшчэ ў вайну, у 1943 годзе.

Да 130-х угодкаў Янкі Купалы, якія адзначаліся 7 ліпеня, у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася выстава пад назвай "Мой дружа, Янка". Яе матэрыялы расказваюць пра гісторыю сяброўства Песняроў. На выставе прадстаўлены першыя зборнікі вершаў паэтаў — "Жалейка" і "Песні жальбы", а таксама выданні нумароў газеты "Наша ніва" з іх творамі. Можна пабачыць вершы-прысвячэнні Якуба Коласа Янку Купалу, рукапісы ўспамінаў і артыкулаў, прысвечаных сябру. Праз прызму тых дакументаў цікава зазірнуць у мінулае, лепш зразумець, чым жылі класікі беларускай літаратуры.

"Мае дрэвы павырасталі. Проста не верыцца, што я саджаў іх 36 гадоў таму назад і так паразрасталіся яны за гэты час..." — так пісаў у сваім дзённіку 2 чэрвеня 1947 года Якуб Колас.

Прыемна, што час і людзі зберaглі тую памятку даўніх гадоў. А некаторыя мастакі і цяпер звяртаюцца ў сваіх творах да той сустрэчы ў Смольні. У прыватнасці, згадаўшы словы самога Коласа пра ліпы, якія "проста просяць пэндзля мастака-пейзажыста", прыгожыя дрэвы наднёманскай сядзібы напісаў і Уладзімір Сулкоўскі. Ён, дарэчы, увогуле стварыў адметны серыял жывапісных палотнаў "Радзіма Якуба Коласа".

НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

Што поле ўродзіць, тое жнівень знаходзіць

Рэгіна Гамзовіч

У апошні месяц лета вяскоўцы збіраюць ураджай і сеюць азімыя

Як вядома, беларуская назва месяца паходзіць ад асноўнай справы селяніна ў гэтую пару — жніва. Заканчваецца ўборка азімых, яравых культур. У агародзе даволі гародніны, у садзе паспела садавіна, у лесе поўна грыбоў і ягад. Толькі паспявай, гаспадыня, назапашваць усяго на халодную пару года. Месяц лічыцца пачаткам восені, з ёй прыйдуць і зацяжныя дажджы.

1 жніўня — прысвятак Макрыны.

2 жніўня — Ілья. Свята земляробства, пра якое кажуць: "Ілья нарабіў гнілля". У гэты час вяскоўцы самі заканчвалі касавіцу і талакой ішлі касіць удовам.

4 жніўня — Мар'я або Магдалена. І гэты дзень таксама звязваюць з макрэчай: "Магдалена — вады па калена".

6 жніўня беларусы святкуюць дзень апекуна земляробства Барыса (яго яшчэ называюць Глеб, Хлеб Барыс, Барыс Палікоп). Пра гэты дзень кажуць: "Барыс і Глеб — паспеў хлеб", "Святы Барыс снапы возіць". У полі не працавалі, бо баяліся грому.

7 жніўня — прысвятак Ганны. Вобраз святой Ганны звязваюць з дбайнай жняёй. У гэты дзень можна было працаваць у полі толькі талакой.

9 жніўня — Палікоп, дзень жніва, калі баяліся маланкі, якая паліць копы жыта, таму стараліся ў полі не працаваць. А ў Столінскім раёне папярэджвалі: "На Палікопу як робіш, выйдэ хмара і ўдарыць гром, спаліць копу хлеба".

10 жніўня — прысвятак Лаўрын, у які ўжо везлі першае жыта на муку малоць. Вядомае выслоўе: "На Лаўрына спяшай да млына".

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Імгненні майстэрства і натхнення

Пятро Лодкін

Работа магілёўскай фотамастачкі Марыны Тупальскай "Свет музыкі" атрымала залаты медаль "Аўстрыйскага суперкруга" — самага вялікага фотасалона свету

Свае фотаработы на прэстыжны фотасалон дасылаюць як аматары, так і прафесіяналы. Аўтарытэтнае журы вызначае лепшую фатаграфію года сярод работ, выкананых у розных стылях і тэхніках. Маштаб мерапрыемства ўражвае: штогод у Аўстрыю прыходзіць больш за 50 тысяч здымкаў з больш чым 100 краін. Марына Тупальская займаецца фатаграфіяй больш за 10 год, у Магілёве вядомая найперш як дзіцячы фатограф і ўдзельніца фотаклуба "Студыя 3 plus". Назіральнасць, цярплівасць і ўважлівасць дапамагаюць ёй рабіць запамінальныя здымкі. Фотааб'ектыў Марыны нібы выхоплівае з жыцця яго шчаслівыя імгненні. Магіляўчанка, дарэчы, перамагала ўжо на конкурсе жаночай фатаграфіі ў Кіеве. А сёлета яе фотаработы экспанаваліся на аўстрыйскім фотасалоне. Яе творы адабраны і для паказу на самым буйным фотасалоне Кітая.

Наогул "Студыя 3 plus" — брэнд, вядомы сярод фотамастакоў розных краін. Работы ўдзельнікаў студыі можна пазнаваць па "ракурсах" шчырасці і адкрытасці, з якімі яны зроблены. І тэмы бываюць розныя, а карпаратыўны творчы почырк угадваецца. Студыі больш за 20 гадоў: у 1991-м пры газеце "Працоўная слава" Магілёўскага аб'яднання "Хімвалакно" сабралася творчая група фотааматараў. То была ініцыятыва ўжо вядомага ў горадзе фотамастака Аляксандра Ліціна і пачаткоўцаў Мірона Шчудло, Міхаіла Гозмана.

Свет музыкі. Здымак Марыны Тупальскай

Студыя мае вядомасць не толькі ў Беларусі: выставы магіляўчан тройчы экспанаваліся ў Расіі, дзевяць разоў ва Украіне, а таксама ў Латвіі, Эстоніі, Ізраілі, Аўстрыі, Германіі. Работы дасылаліся на 500 міжнародных фотасалонаў у 37 краінах. Студыйцы атрымалі на іх 20 залатых, 5 сярэбраных, 25 бронзавых медалёў, 5 ганаровых стужак FIAP, больш за 80 дыпломаў. На фотафоруме ў Люксембургу "Студыю 3 plus" назвалі адной з лепшых сярод фотаклубаў свету. Студыйцы годна прадстаўляюць Беларусь на імпрэзах. Па словах кіраўніка фотастудыі Мірона Шчудло, магіляўчане даслалі ў Аўстрыю 58 работ. Мірон упэўнены: студыйцы і надалей будуць удзельнічаць у міжнародных конкурсах і выставах. Будуць і новыя перамогі.

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар: Віктар Міхайлавіч Харкоў
Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
E-mail: golas_radzimy@tut.by

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1945, Заказ: 0846
Час падпісання ў друк: 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2012